*А. В. КАСІМАВА*

# ВЫСТАВАЧНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ БЕЛАРУСКІХ МУЗЕЯЎ У ПЕРШЫЯ ПАСЛЯВАЕННЫЯ ДЗЕСЯЦІГОДДЗІ (1945–1965 гг.) (на прыкладзе Дзяржаўнай карціннай галерэі БССР)

*Аднаўленне дзейнасці беларускіх музеяў, якая была перарвана Вялікай Айчыннай вайной, пачалося пасля вызвалення Беларусі. Асноўнай задачай музейнага будаўніцтва было адраджэнне фондавых калекцый музеяў, страчаных падчас вайны, таму выставачнай дзейнасці не надавалася значнай увагі. Першым буйным музеем, які прызнаў выстаўку як дзейсны сродак культурнай прапаганды, стала Дзяржаўная карцінная галерэя БССР (пазней Дзяржаўны мастацкі музей БССР). У перыяд з 1945 г. па 1965 г. яна здолела не толькі ўзнавіць свае страчаныя калекцыі, але і арганізаваць больш за 20 выставак рознай тэматыкі як у залах музея, так і па-за яго межамі.*

Адным з найважнейшых кірункаў навукова-даследчай, асветніцкай і прапагандысцкай дзейнасці музеяў з’яўляецца арганізацыя выставак. Выстаўкі павышаюць даступнасць музейных калекцый, уводзяць у навуковы і культурны абарот помнікі, якія знаходзяцца ў зборах музеяў, і садзейнічаюць прыцягненню ўвагі да музея. Гэтыя фактары асабліва важныя для аднаўлення пасляваеннай дзейнасці музеяў.

Матэрыялы, прысвечаныя выставачнай дзейнасці беларускіх музеяў у пасляваенны час, амаль не сустракаюцца ў перыядычных і навуковых выданнях. Пры напісанні дадзенага артыкула асаблівая ўвага надавалася архіўным звесткам Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва [1–4]. Шмат карыснай інфармацыі змешчана ў каталогах выставак, якія выдаваліся ў БССР [5–9; 12]. Сярод матэрыялаў перыядычнага друку трэба ўзгадаць артыкулы пра жыццё і дзейнасць А.В.Аладавай – першага дырэктара карціннай галерэі [14].

Аднаўленне дзейнасці беларускіх музеяў пасля вайны пачалося ўжо ў сакавіку 1945 г. Менавіта тады ў Мінску адбыўся семінар для музейных работнікаў. На ім былі абмеркаваны стан музеяў БССР, у якім яны апынуліся пасля заканчэння вайны, і асноўныя задачы музейнага будаўніцтва. Па выніках работы семінара быў распрацаваны першы ў пасляваенны час нарматыўны дакумент у галіне музейнай справы – “Тыпавое палажэнне аб музеях Беларускай ССР, якія знаходзяцца на мясцовым бюджэце”. Ва ўмовах адсутнасці ў нашай краіне музейнага заканадаўства дадзенае палажэнне заклала юрыдычныя асновы практычнай дзейнасці па аднаўленні музейнай сеткі БССР. Акрамя таго, яно замацавала за музеямі статус не толькі прапагандысцкай, але і навукова-даследчай установы. Палажэнне вызначала і фінансава-эканамічныя асновы дзейнасці музеяў, у прыватнасці, дазваляла мець свае ўласныя грашовыя сродкі. Гэта было вельмі важна, бо дапамагала забеспячэнню матэрыяльна-тэхнічнай базы музеяў, асабліва краязнаўчых (а іх была пераважная большасць).

Не апошнюю ролю ў практычнай задачы аднаўлення музеяў у першыя пасляваенныя гады адыграў закон “Аб пяцігадовым плане ўзнаўлення і развіцця народнай гаспадаркі СССР”, прыняты Вярхоўным Саветам СССР у сакавіку 1946 г. Закон быў аднолькава абавязковы для выканання як у вытворчай, так і невытворчай сферы дзейнасці. Вызначаная ў ім задача павелічэння па ўсіх паказчыках даваеннага ўзроўню патрабавала ад музеяў перш за ўсё аднаўлення музейнай сеткі краіны. Аднак выкананню гэтай задачы замінала адсутнасць прыстасаваных памяшканняў для музеяў, а таксама адсутнасць падрыхтаваных музейных спецыялістаў (на кіруючыя пасады ў музеі прыходзілі людзі, абыякавыя да гэтай справы і часта не мелі ўяўлення аб працы ў музеі). Тым не менш ужо на пачатак 1951 г. у БССР працавалі 22 музеі, з іх 6 – у Мінску (Дзяржаўная карцінная галерэя БССР, Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Дом-музей I з’езда РСДРП, Літаратурны музей Я.Купалы, Геолага-мінералагічны музей БДУ, Заалагічны музей БДУ) [10, с. 46].

Наступным крокам аднаўлення музейнай дзейнасці было адраджэнне калекцый, страчаных падчас вайны. Аднак тут перавага аддавалася не вяртанню нацыянальнай спадчыны, вывезенай немцамі, а фарміраванню калекцый, якія адлюстравалі сучаснасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Перш за ўсё гэта тычылася сучаснага мастацтва. Каб дапамагчы музеям камплектаваць свае фонды матэрыяламі савецкай гісторыі, Савет Міністраў БССР прыняў у 1947 г. пастанову "Аб мерапрыемствах па паляпшэнні паказу сацыялістычнага будаўніцтва ў музеях БССР". Дзеля гэтага ўсе міністэрствы, ведамствы і выканкамы павінны былі бясплатна перадаваць у музеі экспанаты, якія характарызуюць гісторыю прадпрыемстваў, аднаўленне народнай гаспадаркі і культуры, а таксама мадэлі, схемы і макеты станкоў, прыстасаванняў і іншых вынаходак. Мастацкія калекцыі, што адлюстроўвалі дадзеную тэматыку, фарміраваліся Цэнтральным закупачным фондам пры Камітэце па справах культурна-асветных устаноў. Такім чынам, была абвешчана дзяржаўная праграма камплектавання фондавых калекцый беларускіх музеяў матэрыяламі пра сучаснасць. Асноўным недахопам гэтай праграмы была яе ідэалагічная накіраванасць, якая не давала магчымасці ўсебакова паказваць жыццё тагачаснага беларускага грамадства.

Трэба адзначыць, што ў развіцці ўсёй пасляваеннай культуры, і ў прыватнасці музейнай дзейнасці, не апошнюю ролю адыгралі так званыя "ждануўскія пастановы" (1946–1948). Яны пакладзены ў аснову ідэалагічнай кампаніі па "барацьбе з касмапалітызмам і нізкапаклонствам перад Захадам". Сусветная культура і мастацтва былі падзелены па класавай прымеце на сацыялістычныя і буржуазныя. Гэтыя "тэарэтычныя распрацоўкі" былі прыняты ўсімі ўстановамі культуры, у тым ліку і музеямі. Таму ў савецкіх музеях былі распрацаваны канкрэтныя мерапрыемствы па рэалізацыі гэтых "наказаў партыі". У выніку і планаванне выставачнай дзейнасці адбывалася з улікам неабходнасці прапагандаваць толькі творы сучасных савецкіх майстроў, якія з пафасам адлюстроўвалі савецкія рэаліі.

Дзяржаўная карцінная галерэя БССР адна з першых сярод музеяў у пасляваеннныя гады распачала ў БССР актыўную выставачную дзейнасць. Праца па аднаўленні гэтага напрамку дзейнасці пачалася ў Маскве яшчэ летам 1944 г. Тады галерэя ўдзельнічала ў падрыхтоўцы юбілейнай выстаўкі, прысвечанай 25-годдзю БССР, якая праходзіла ў Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі. Лепшыя экспанаты выстаўкі па рашэнні ўрада БССР былі набыты ў мастакоў і склалі аснову карціннай галерэі БССР.

Пасля вызвалення Мінска ў залах другога паверха Дома прафсаюзаў, дзе ў той час ужо знаходзіліся Белдзяржмузей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і Літаратурны музей Я.Купалы, галерэя правяла першую мастацкую выстаўку прац, створаных у перыяд Вялікай Айчыннай вайны беларускімі мастакамі.

3 ліпеня 1946 г. карцінная галерэя правяла Рэспубліканскую мастацкую выстаўку, прысвечаную другой гадавіне вызвалення г. Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На ёй былі прадстаўлены творы вядомых беларускіх мастакоў А.П.Марыкса, В.К.Цвірко, Я.Я.Красоўскага і інш. Іх працы пасля закрыцця выстаўкі склалі аснову аддзела савецкага мастацтва галерэі [1, с. 2].

Першым і на доўгі час нязменным дырэктарам галерэі стала Алена Васільеўна Аладава (1907–1986). Дзякуючы яе актыўнай дзейнасці як дырэктара (з 1944 г.) практычна нанава ствараліся страчаныя падчас Вялікай Айчыннай вайны фондавыя калекцыі, а таксама былі арганізаваны больш за сто навуковых экспедыцый у розныя рэгіёны рэспублікі, у выніку чаго былі выратаваны каля дзвюх тысяч твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Адсутнасць уласнага памяшкання не давала музею магчымасці разгарнуць стацыянарную экспазіцыю. У "Справаздачы аб працы Дзяржаўнай карціннай галерэі" А.В.Аладава адзначала: "Отсутствие соответствующего здания или хотя бы до некоторой степени удовлетворительного помещения крайне тормозит разворот работы галереи" [2, с. 1]. Таму асноўны акцэнт у экспазіцыйнай дзейнасці ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе рабіўся на правядзенні выставак. Так, напрыклад, толькі за 1946 г. Дзяржаўная карцінная галерэя правяла наступныя выстаўкі: прац заслужанага дзеяча мастацтваў А.П.Марыкса; прац жанчын-мастачак, прысвечаную 8 Сакавіка; прац мастакоў БССР, прысвечаную выбарам у Вярхоўны Савет БССР; Усебеларускую мастацкую выстаўку, на якой выстаўляліся працы мастакоў БССР, прысвечаныя другой гадавіне вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў; Рэспубліканскую выстаўку графікі; Рэспубліканскую выстаўку дзіцячага малюнка.

Яшчэ адной прычынай, якая замінала развіццю выставачнай дзейнасці карціннай галерэі, была адсутнасць неабходнай колькасці навуковых супрацоўнікаў. А.В.Аладава ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пісьме да намесніка начальніка Упраўлення па справах мастацтва М.М.Ваганавай падкрэслівала, што "абслугоўванне выставак немагчыма для штата галерэі, які складаецца з трох навуковых супрацоўнікаў..." [4, с. 13]. Тым не менш карцінная галерэя прыкладала ўсе намаганні для таго, каб выконваць план як па навукова-даследчай, так і па выставачнай дзейнасці.

Значнай падзеяй у культурным пасляваенным жыцці нашай краіны стала Усебеларуская мастацкая выстаўка 1946 г., якая адкрылася ў карціннай галерэі. Большасць тэматычных твораў, што экспанаваліся на выстаўцы, былі прысвечаны другой гадавіне гераічнага вызвалення Беларусі ад нямецкіх захопнікаў і партызанскаму руху. У ліку іх "Вызваленне з няволі" Я.Красоўскага, "Апавяданне байца" Я.Ціхановіча, "Сустрэча партызан з Чырвонай Арміяй" У.Сухаверхава. Недахопамі выстаўкі былі адсутнасць на ёй твораў, напісаных на тэмы аднаўлення разбуранай гаспадаркі, і жанравых палотнаў [7, с. 2].

У тым жа годзе для правядзення выстаўкі, прысвечанай 70-годдзю І.В.Сталіна, Дзяржаўная карцінная галерэя БССР атрымала для экспанавання ад Мастацкага фонду СССР дзве працы: "Брыгада высокай якасці Мінскага тонкасуконнага камбіната" Я.Я.Красоўскага і "Сталін каля Маўзалея" І.А.Давідовіча [3, с. 15]. Гэты факт можна лічыць пачаткам фарміравання асноў усесаюзнай музейнай дзейнасці, якая пасля распаду СССР трансфармуецца ў міжнародную.

Да 3 ліпеня 1947 г. галерэя змагла падрыхтаваць экспазіцыю аддзела рускага і сучаснага мастацтва. Аднак адкрыццё экспазіцыі зацягвалася па прычыне адбору прац беларускіх мастакоў да юбілейнай выстаўкі, прысвечанай 30-годдзю савецкай улады.

У 1949 г. БССР адзначала 10-годдзе ўз'яднання беларускага народа ў складзе Савецкай дзяржавы. У сувязі з гэтай датай Дзяржаўная карцінная галерэя ў памяшканні тэатра оперы і балета арганізавала мастацкую выстаўку, на якой былі прадстаўлены творы жывапісу, скульптуры і графікі мастакоў Савецкай Беларусі. У тым жа годзе карцінная галерэя БССР прымае рашэнне правесці працу па папулярызацыі савецкага мастацтва шляхам арганізацыі перасоўных выставак на прадпрыемствах г. Мінска і ў абласных цэнтрах Беларусі. З гэтага часу перасоўныя выстаўкі становяцца асноўным відам дзейнасці ўсіх беларускіх музеяў. Арганізацыя і правядзенне такіх выставак мела як станоўчыя, так і адмоўныя бакі. Да станоўчых можна аднесці тое, што дзякуючы перасоўным выстаўкам шматлікія жыхары розных куткоў БССР мелі магчымасць пазнаёміцца з калекцыямі музеяў. Аднак ідэалагічная накіраванасць выставак і экспанаванне прац савецкіх мастакоў, якія ў большасці адлюстроўвалі тэму станаўлення савецкай ўлады і гераічнай барацьбы народа супраць фашысцкіх захопнікаў, прыводзіла да аднабаковасці зместу гэтых выставак і не давала магчымасці поўнасцю сфарміраваць уяўленне аб сапраўдных каштоўнасцях беларускіх музеяў.

Нягледзячы на матэрыяльныя цяжкасці першых дзесяцігоддзяў пасля вайны, Дзяржаўная карцінная галерэя імкнулася да разнастайнасці тэматыкі ў правядзенні выставак. Напрыклад, у 1952 г. была арганізавана выстаўка выяўленчага мастацтва Беларусі ў Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі. Для яе былі адабраны 143 творы жывапісу, 90 графічных прац і 46 скульптур з фондаў карціннай галерэі [4, с. 7].

У 1955 г. у рамках дамоўленасці аб культурным супрацоўніцтве паміж БССР і ПНР Міністэрства культуры Польшчы сумесна з Саюзам польскіх мастакоў арганізавалі ў карціннай галерэі БССР выстаўку польскага жывапісу і графікі. Яна адлюстроўвала дасягненні польскага мастацтва за апошнія дзесяцігоддзі і складалася з двух аддзелаў: старажытнага мастацтва і сучаснага мастацтва. Аддзел, прысвечаны старажытнаму мастацтву, па колькасці экспанатаў быў значна меншы, чым аддзел сучаснага мастацтва. Не ставячы перад сабой мэту поўнасцю адлюстраваць гісторыю польскага жывапісу і графікі, арганізатары выстаўкі імкнуліся паказаць асноўныя моманты развіцця выяўленчага мастацтва і пазнаёміць з выдатнымі мастакамі мінулага (Матэйка, Багарэлі, Марцэлі). Аддзел сучаснага мастацтва быў прадстаўлены графічнымі творамі, а таксама плакатамі на сатырычныя тэмы [6, с. 3].

У 1957 г. карцінная галерэя БССР атрымала новую назву – Дзяржаўны мастацкі музей БССР. У гэтым жа годзе з мэтай ліквідацыі недахопу інфармацыі аб выяўленчым мастацтве Італіі Італьянскім таварыствам культурнай сувязі з СССР пры дапамозе

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Беларускага таварыства культурнай сувязі з заграніцай у Дзяржаўным мастацкім музеі БССР была арганізавана выстаўка малюнкаў, афортаў і літаграфій сучасных мастакоў Італіі. На ёй экспанаваліся творы 33 мастакоў, выкананыя алоўкам, вуглём, пяром [5, с. 3].

У лістападзе 1957 г. у Маскве пачала сваю працу Усесаюзная выстаўка, прысвечаная 40-годдзю савецкай улады. На ёй былі прадстаўлены лепшыя творы мастацтва ўсіх саюзных рэспублік, у тым ліку і 130 прац 40 беларускіх майстроў [11, с. 3].

У наступным годзе Дзяржаўны мастацкі музей БССР арганізаваў выстаўку твораў беларускіх мастакоў, прысвечаную 40-годдзю Савецкай Арміі. На ёй былі прадстаўлены творы сучаснага жывапісу (Я.М.Ціхановіч, Я.Я.Красоўскі, В.К.Цвірка), скульптуры (З.І.Азгур, А.А.Бембель, А.К.Глебаў), графікі (У.Ф.Сакалоў, А.М.Тычына), плакаты (С.Р.Раманаў і інш.) [9, с. 6].

Сімвалам дружбы румынскага і беларускага народаў стала выстаўка выяўленчага мастацтва Румынскай Народнай Рэспублікі, якая адбылася ў жніўні – кастрычніку 1959 г. у мастацкім музеі. Адкрыццё выставы супала са святкаваннем 15-й гадавіны з дня вызвалення Румыніі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На ёй у асноўным экспанаваліся творы мастакоў першых дзесяцігоддзяў ХХ ст.: А.Бенчылэ, Н.Таніца, І.Ізэра, К.Рэсу [12, с. 3].

У 1960 г. у Дзяржаўным мастацкім музеі БССР прайшла выстаўка экслібрыса XIX–XX стст. Яна была арганізавана на матэрыяле калекцыі экслібрысаў мастака А.М.Тычыны, збіральніка і аўтара-выканаўцы большасці кніжных знакаў. Такая выстаўка праводзілася ў Беларусі ўпершыню і стала адметнай з’явай у культурным жыцці [13, с. 199].

Да ліку найцікавейшых музейных праектаў, праведзеных мастацкім музеем БССР у першыя дзесяцігоддзі пасля вайны, можна аднесці выстаўку твораў рускага мастацтва з прыватных калекцый Масквы, Ленінграда і Мінска, якая праходзіла ў 1962 г. На ёй былі прадстаўлены творы XVIII–XX стст. Заслугоўвалі ўвагі “Партрэт віцэ-канцлера пры Паўле І князя А.Б.Куракіна” працы невядомага майстра XVIII ст. і “Партрэт князя Абаленскага ў маскарадным касцюме” В.Трапініна. Сярод твораў другой паловы XIX ст. прыцягвалі ўвагу жанравыя карціны У.Пярова, У.Макоўскага, пейзажы І.Шышкіна, партрэты І.Рэпіна, В.Сярова, творы І.Айвазоўскага і інш. [8, с. 5].

Багатым на цікавыя музейныя праекты выдаўся 1965 г. У студзені гэтага года адкрылася выстаўка твораў рускага мастацтва XVIII–XX стст. з фондаў Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі. У верасні прайшла выстаўка графікі “Югаслаўскае выяўленчае мастацтва ў нацыянальна-вызваленчай вайне 1941–1945 гг.” з музеяў і прыватных збораў Югаславіі. У кастрычніку 1965 г. пачала працаваць выстаўка “Сучасная бельгійская графіка” з фондаў Дзяржаўнага Эрмітажа [13, с. 210–211].

Такім чынам, у перыяд з 1945 г. па 1965 г. Дзяржаўнай карціннай галерэяй (затым Дзяржаўным мастацкім музеем БССР) было прынята ў нашай краіне і праведзена за межамі музея больш за дваццаць выставак рознага кшталту.

У асноўным тэматыка музейных выставак была прысвечана вызваленню беларускага народа ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Тым не менш карцінная галерэя БССР (пазней музей) імкнулася да арганізацыі разнапланавых выставак. Трэба нагадаць, што большасць выставак, праведзеных у разглядаемы перыяд, былі б немагчымы без намаганняў, якія прыкладала да іх здзяйснення дырэктар музея А.В.Аладава.

Аднак узровень і тэматыка выставак, якія праводзіліся ў БССР, значна адрозніваліся ад тых выставак, што арганізоўваліся, напрыклад, у Маскве ці Ленінградзе. У той час там праходзілі выстаўкі міжнароднага ўзроўню, такія як выстаўка твораў сусветнага мастацтва, якія былі выратаваны савецкімі войскамі (1958), “Мастацкае рамяство Цэйлона” (1959), “Чэхаславацкае шкло” (1959) і інш.

Дзяржаўны мастацкі музей БССР пад кіраўніцтвам А.В.Аладавай імкнуўся да пашырэння тэматыкі выставачнай дзейнасці. Але фармальна-ідэалагічныя адносіны партыйных органаў да музея не давалі магчымасці змяніць кірункі і тэматычную афарбаванасць выставак, што праходзілі ў той час. Таму большасць пасляваенных выставак былі прысвечаны паказу сучасных прац беларускіх мастакоў або святкаванню значных дат у палітычнай гісторыі БССР. Складалася ўражанне, што музей можа прапанаваць гледачам толькі творы сучасных аўтараў, прысвечаныя ў асноўным будаўніцтву

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

камунізму. Аднак у пачатку 1960-х гг. музей пачаў мяняць кірункі выставачнай дзейнасці, што было звязана з палітыкай “хрушчоўскай адлігі”.

---


1. *Беларускі* дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва. – Ф. 164. – Воп. 1. – Спр. 20. – Арк. 2.

2. *Там жа.* Фонд 164. – Воп. 1. – Спр. 28. – Арк. 1.

3. *Там жа.* Ф. 164. – Воп. 1. – Спр. 41. – Арк. 15.

4. *Там жа.* Ф. 164. – Воп. 1. – Спр. 54. – Арк. 7.

5. *Выстава* малюнкаў, афортаў і літаграфій сучасных мастакоў Італіі: каталог. – Мн., 1957. – 23 с.

6. *Выстаўка* польскага выяўленчага мастацтва: каталог. – Мн.: Б.в., 1955. – 54 с.

7. *Выстава* работ беларускіх мастакоў, прысвечаная другой гадавіне вызвалення БССР ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў: каталог. – Мн.: Дзяржаўная карцінная галерэя, 1946. – 5 с.

8. *Выставка* русского искусства из частных собраний: каталог / сост. П.Н.Герасимович. – Мн.: Государственная картинная галерея, 1962. – 74 с.

9. *Выстаўка* твораў беларускіх мастакоў, прысвечаная 40-годдзю Савецкай Арміі: каталог / склад. В.Баравік, Н.Бараноўская. – Мн.: Дзяржаўная карцінная галерэя, 1958. – 18 с.

10. *Гужалоўскі, А.А.* Музеі Беларусі (1941–1991) / А.А.Гужалоўскі. – Мн.: Нац. архіў РБ, 2004. – 218 с.

11. *Данилевич, В.* Ещё одна сокровищница / В.Данилевич // Советская культура. – 1957. – № 160 (706). – С. 3.

12. *Дні* румынскай культуры ў Беларусі (жнівень – кастрычнік 1959): каталог. – Мн.: Дзяржаўная карцінная галерэя, 1959. – 67 с.

13. *Сообщения* Государственного художественного музея БССР.Вып. 1. – Мн.: Навука і тэхніка, 1994. – 400 с.

14. *Усава, Н.* Малавядомыя старонкі з жыцця Алены Аладавай / Н.Усава // Выяўленчае мастацтва. – 2004. – № 6 (255). – С. 13–15.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ